**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
220004 г. Мінск, праспект Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ДАЗВОЛ
## на выкананне навукова-даследчых і праектных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях
ад 27 траўня 2024 г. № 04-01-08/168

Дазвол сапраўдны да прыёмкі ў эксплуатацыю матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці

У адпаведнасці з артыкулам 115 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс) дазвол выдадзены Гродзенскаму гандлёва-вытворчаму РУП "Фармацыя"

| | |
|---|---|
| на правядзенне навукова-даследчых і праектных работ | па рэканструкцыі і рамонце будынка па вул. Ажэшкі, 11 у г. Гродна ў складзе |
| матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці катэгорыі "2" | "Забудова вул. Ажэшкі" ў г. Гродна. |

Асобыя ўмовы:

распрацоўку навукова-даследчых і праектных работ на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ ажыццяўляць арганізацыямі, у штаце якіх працуюць грамадзяне, якія маюць пасведчанне атэставанай асобы, або індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія маюць пасведчанне атэставанай асобы (п. 5 артыкула 115 Кодэкса), пад кіраўніцтвам грамадзяніна (у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка), які мае пасведчанне на кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі (п. 1 артыкула 116 Кодэкса);

распрацаваць і прадставіць ў Міністэрства культуры рэстаўрацыйнае заданне (пункт 1 артыкула 118 Кодэкса);

навукова-праектныя работы выконваць на падставе матэрыялаў навукова-даследчых работ, выкананых у аб'ёме, неабходным для абгрунтавання праектных рашэнняў (артыкул 112 Кодэкса), згодна з патрабаваннямі праекта зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці "Гістарычны цэнтр г. Гродна", зацверджанага пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 23.09.2019 № 56;

прымаемые навукова і метадычна абгрунтаваныя праектныя рашэнні павінны прадугледжваць безумоўнае захаванне і (або) аднаўленне адметных вартасцей (дэкаратыўных, мастацкіх, архітэктурных і іншых каштоўных элементаў) гісторыка-культурнай каштоўнасці без допушчэння іх страты і змянення аб'ёмна-прасторавых рашэнняў (артыкулы 103, 104, падпункт 1.9 артыкула 114 Кодэкса);

праектныя прапановы па стварэнні дадатковых асобных уваходаў ці змяненні іншых канструктыўных элементаў, не пацверджаныя матэрыяламі навукова-даследчых работ (архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні), прыводзяць да навукова неабгрунтаванага змянення архітэктурнага рашэння гісторыка-культурнай каштоўнасці і ўзгадненню не падлягаюць (артыкулы 103, 104, 109 Кодэкса);

праектныя рашэнні, якія могуць прывесці да навукова неабгрунтаваных змяненняў архітэктурнага аблічча гісторыка-культурнай каштоўнасці, пагаршэння візуальных умоў яе ўспрымання і страты адметных вартасцей, парушыць гістарычны характар размяшчэння гісторыка-культурнай каштоўнасці ў навакольным асяроддзі не дапускаюцца;

забяспечыць захаванне і (або) аднаўленне аўтэнтычных будаўнічых канструкцый, у тым ліку аконных і дзвярных запаўненняў з захаваннем гістарычных памераў, імпостаў, колеру і матэрыялаў;

выключыць уладкаванне на фасадах аб'екта спадчыны актыўных дысаніруючых (не характэрных) элементаў, інжынернага і іншага абсталявання;

прадугледзець выкарыстанне рэстаўрацыйных методык і будаўнічых матэрыялаў, характэрных для гісторыка-культурнай каштоўнасці;

навукова-праектную дакументацыю прадставіць на ўзгадненне ў **Міністэрства культуры** (артыкул 119 Кодэкса);

для атрымання дазволу на працяг работ прадставіць у Міністэрства культуры справаздачу аб выкананых работах за папярэдні год, падрыхтаваную асобай, на якую ўскладзены абавязак кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі;

дадзены дазвол не вызваляе ад неабходнасці атрымання іншай дазвольнай дакументацыі ў адпаведнасці с заканадаўствам.

Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць катэгорыі “2” – “Забудова вул. Ажэшкі” ў г. Гродна пад шыфрам 412Г000005 уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

Намеснік Міністра С.А.Саракач

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ

Мікуловіч 327 39 17